▪ Са святам!

# «Нам – 40»

*Люблю ва ўсім размах і рух,*
*Вітаю поспехі навукі!*
*І ўдумна зноў і зноў бяру,*
*Нібы ікону, кнігу ў рукі.*

**Васіль Андрыеўскі**

**Пад такой назвай прайшло святочнае мерапрыемства, прымеркаванае да 40-гадовага юбілею з дня заснавання гарадской дзіцячай бібліятэкі мікрараёна Маладзёжны.**

8 верасня 1979 года ўпершыню для сваіх маленькіх чытачоў адчыніла дзверы наша бібліятэка. 40 год бібліятэка рабіла і робіць галоўнае: далучае дзяцей да ведаў, вучыць іх думаць, чытаць, марыць. За гэты час яна заўсёды заставалася верным сябрам сваім юным наведвальнікам. На сённяшні дзень галоўнае дасягненне дзіцячай бібліятэкі – гэта чытачы – разумныя, таленавітыя, пытлівыя… Імі і для іх жыве і працуе калектыў бібліятэкі.

Павіншаваць бібліятэку і яе калектыў са святам прыйшлі чытачы і ветэраны бібліятэчнай справы, якія ўнеслі свой значны ўклад у яе развіццё ў мінулым. Сярод запрошаных гасцей прысутнічала і **Жураўская Алена Дзянісаўна** – першы бібліятэкар і першы загадчык дзіцячай бібліятэкай.

Госці свята разам з вядучымі здзейснілі віртуальную экскурсію ў мінулае бібліятэкі, да прагляду гасцей была падрыхтавана электронная прэзентацыя пра сучасную работу. Прыгожыя падарункі да юбілею падрыхтавалі вучні Мазырскай дзіцячай школы мастацтваў № 2. Удзячныя чытачы віншавалі бібліятэкараў вершаванымі радкамі. Свята атрымалася цікавым і карысным як для чытачоў, так і для працаўнікоў бібліятэкі розных пакаленняў.




**Бібліятэкары Зданевіч Н. Л., Сінькевіч М. С., Бандарэнка М. В., загадчык бібліятэкай Шумская Н. Ф., бібліятэкары Каралькова А. П., Бобех С. В.**

Да юбілею была арганізавана "БлагоДАРИТельная" акцыя "Імя на кнізе" па збору кніг для дакамплектавання бібліятэчнага фонду. Сваё імя і віншаванне з юбілеем патрэбна было напісаць і пакласці ў кнігу, якую затым можна падараваць. Дзякуючы гэтай акцыі фонд бібліятэкі папоўніўся больш чым на 80 экзэмпляраў кніг. Акцыя працягваецца, і можна ўсёй прыняць удзел усім жадаючым. Лепшы падарунак – гэта кніга, якая будзе радаваць не адно пакаленне юных чытачоў.

*Напярэдадні Дня бібліятэк Беларусі калектыў гарадской дзіцячай бібліятэкі мікрараёна Маладзёжны віншуе ўсіх калег з надыходзячым святам. Жадаем усім здароўя, творчых поспехаў, новых праектаў, шмат цікавых кніг і безліч наведвальнікаў.*

**Надзея ШУМСКАЯ,**
**загадчык гарадской дзіцячай бібліятэкай мікрараёна Маладзёжны.**